**УДК 821.161.3-14*Я.Янішчыц**

*А. М. Фелькіна*

# ВОБРАЗ ЛІРЫЧНАЙ ГЕРАІНІ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

*Артыкул прысвечаны даследаванню вобраза лірычнай гераіні ў інтымных вершах Я. Янішчыц, яе эвалюцыі. Даводзіцца, што ў ранняй лірыцы лірычная гераіня – гэта закаханая дзяўчына, якая жыве марамі пра свайго адзінага і верыць у шчаслівую будучыню. У далейшым лірычная гераіня пераўвасабляецца ў жанчыну, якая набыла жыццёвы вопыт і жыве ў рэальнасці, не такой шчаслівай, як марылася.*

Яўгенія Янішчыц – лірычная паэтэса, таленавітая жанчына, якую прырода надзяліла незвычайным талентам, адкрыла запаветнае слова. Слова, якое здольнае тварыць цуды: апяваць прыгажосць роднага краю, узрушваць людскія думкі і перажыванні, ачышчаць душы. Лірыка паэтэсы грунтуецца на ўласна перажытым вопыце, яе вершы – гэта шчырая, адкрытая споведзь, якая не пакідае чытача абыякавым.

Паэзія Я. Янішчыц прасякнута моцнымі інтымнымі перажываннямі. Што да любоўнай лірыкі, то паміж паэтэсай і яе лірычнай гераіняй можна наогул паставіць знак роўнасці. Каханне прынесла Я. Янішчыц шмат пакут і болю. У кожным вершы паэтэса зноў і зноў перажывае падзеі, што напаткалі яе на жыццёвым шляху. У вершах аўтарка шмат разважае пра сэнс чалавечага жыцця, а дакладней, пра сэнс жаночага жыцця, жаночага шчасця.

У 1970 г. выйшаў першы зборнік Я. Янішчыц “Снежныя грамніцы”. Гэты зборнік характарызуецца светлымі пачуццямі. Лірычная гераіня ранніх вершаў паэтэсы – шчаслівая жанчына, а шчаслівая таму, бо кахае, бо імкнецца да свайго каханага, свайго адзінага і непаўторнага. Яна чакае і жыве прадчуваннем сустрэчы, спадзяецца на шчаслівае і бесклапотнае будучае. Наступны зборнік паэтэсы “Дзень вечаровы” мае значныя адрозненні ад папярэдняга, у ім пачуццё кахання значна ўскладняецца. Лірычная гераіня ўжо не юная бесклапотная закаханая. Чытач бачыць мудрую, разважлівую, з пэўным жыццёвым вопытам лірычную гераіню. Яна ўжо не жыве марамі і надзеямі, а спрабуе разабрацца ў сваіх пачуццях. Любоўныя вершы ў зборніку прысвечаны ўжо рэальнаму чалавеку, маюць свайго адрасата. Такімі ж пачуццямі прасякнуты і зборнік “Ясельда”.

Інтымная лірыка Янішчыц – гэта песня, споведзь яе душы, якая была перажыта глыбока і цяжка. Лірычная гераіня параўноўвае свой боль з боем, барацьбой з самой сабой. Але, на вялікае шкадаванне, прымірэння не адбылося, душэўныя пакуты ўсё ж такі перамаглі. Лірычная гераіня разумее, што магчыма гэтыя пакуты не пакінуць яе праз усё жыццё:

*Табе, мой боль, табе – больш нікому*
*Я й перад смерцю вымаўлю: люблю* [1].

Кожная гісторыя кахання па-свойму асаблівая, цікавая, таму і эмацыянальны свет лірычнай гераіні мае сваю адметнасць. Увогуле, эмоцыі з’яўляюцца неад’емнай часткай жыцця кожнага чалавека. Эмоцыі даюць уяўленне аб тым, як чалавек ставіцца да рэчаіснасці. Пачуцці і эмоцыі лірычнай гераіні ў вершах Я. Янішчыц маюць дынамічны характар. Як вядома, паэтэса за сваё жыццё набыла горкі вопыт, таму ў паэзіі Я. Янішчыц пачуццё кахання ідзе побач з негатыўнымі эмоцыямі. Здаецца, якія ж негатыўныя эмоцыі могуць быць ад такога светлага пачуцця? А сярод такіх эмоцый можна вылучыць гнеў, які часам прыходзіць на змену каханню.

Лірычная гераіня паэтэсы часта задумваецца над пытаннем, чаму ў такім маладым узросце чалавеку наканавана перажыць столькі цяжкасцей. Чаму для таго, каб быць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шчаслівай, неабходна прайсці такі складаны шлях. А ці прынясуць гэтыя выпрабаванні плён, ці зможа калі-небудзь жанчына сапраўды стаць шчаслівай, знайсці таго адзінага і непаўторнага, дзеля якога захочацца жыць і радавацца гэтаму жыццю? На гэтае пытанне лірычная гераіня не можа даць дакладнага адказу:

*Быць такою маладою*
*Над нядоляй маладой!*
*...Ці ўмыюся слязою,*
*Ці ўсмешкаю тваёй* [1].

Увогуле, адчуванне адзіноты – зямны крыж лірычнай гераіні Яўгеніі Янішчыц. Крыж, з якім наканавана жыць да канца, бо так было прызначана лёсам, такі яе зямны шлях. Жанчына стала ахвярай пэўных абставінаў, яна ўжо змірылася са сваім лёсам і прымае адзіноту як наканаванае Богам:

*Мой боль –*
*На вышыні святла.*
*Таму і ноччу мне світае.*
*А так хацелася цяпла…* [1]

Лірычная гераіня любоўнай лірыкі Я. Янішчыц вельмі баіцца страціць каханага, які цалкам увайшоў у яе жыццё, без яго яна не можа ўявіць сваю будучыню: “я – гэта ты». Эмацыйны стан страху вельмі ярка паказаны ў вершах і прадстаўлены такім чынам: “Баюся паглядзець табе ў вочы”, “Боязна сэрца ў адчаі раскрыць” [1]. Паэтэса прысвяціла таксама некалькі радкоў пачуццю адзіноты, якое вельмі трывожыла яе: “Ці не таму, што адзіноту баюся выдаць на сяле”, “Мама, гэта ноч нагнала страх” [1].

Даўно з’яўляючыся жыхаркай сталіцы, лірычная гераіня Я. Янішчыц у душы ўсё роўна застаецца вясковай натурай. Яна мае моцную сувязь з роднай зямлёю, аднавяскоўцамі і той сялянскай працай, якой навучыла яе з дзяцінства матуля. Я. Янішчыц заўсёды была шчырая ў пачуццях да маці, бо ад мамы нараджаецца жыццё, ад мамы пачынаецца ўсё. “Ад сэрца мамы” – так заўсёды пісала ў сваіх вершах і ўсюды гаварыла паэтэса. Яна абяцае матулі быць здаровай і берагчы сябе, просіць не хвалявацца за яе:

*Мама, сею не жыта я, сею не лён.*
*Але з лёну і жыта я словы складаю.*
*І калі ўглядаюся ў парасткі дзён –*
*Чую крокі твае і свае вымяраю.*
*Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён…* [1]

Увогуле, вобраз лірычнай гераіні Я. Янішчыц – гэта вобраз жанчыны, якая належыць да ХХ стагоддзя, дакладней, да яго канца. Той шлях, тыя выпрабаванні, тыя цяжкасці, якія павінна прайсці лірычная гераіня, пасланыя ёй як на вялікае шчасце, так і на вялікія пакуты і гора, але гераіня Я. Янішчыц не жадае збавення ад гэтых пакутаў. Яна лічыць, што пакуты дадзены чалавеку для таго, каб стаць мацней і таму ўсё яшчэ шчыра верыць, што ўзаемнасцю, шчырасцю можна ўсё паправіць:

*І ўсё, што знікла быццам дым,*
*Што ў цішыні наспела, –*
*Цяплом тваім, святлом тваім*
*Перапісаць набела!* [1]

“Прастора кахання лірычнай гераіні – «стэрылізаваная», пазбаўленая ўсялякіх знакаў цялеснасці, – «свет з белымі бярозамі і сіняй вышынёй». Гэта абсалютная чысціня, якая паказана ў лексемах «белы», «сіні», «бяроза», асуджана на парушэнне каханым чалавекам, бо стасункі двух асоб звычайна набываюць не «вышынныя», а «зямныя» вымярэнні” [2, с. 99].

Цікавым падаецца верш Я. Янішчыц “Золушка”. У ім лірычная гераіня ўваходзіць у прастору кахання “басанож”. Але чаму менавіта басанож? На гэтае пытанне вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўдала адказала Святлана Калядка: "Босая – значыць свабодная, вольная, яшчэ не звязаная «вечнай» сувяззю кахання з ім; босая – гэта прамая «цялесная сувязь» з зямлёй, прыродай, што напаўняюць усю істоту жаданнем кахаць; босая – значыць не залежная ад сацыяльных стэрэатыпаў правільнага кахання" [2, с. 98].

Часта паэтэса параўноўвае лірычную гераіню з птушкай і вельмі яскрава перадае змену эмацыйнага стану жанчыны на радасць, лёгкасць. І гэта нездарма так, бо вобраз птушкі адзін з дамінуючых вобразаў лірыкі Я. Янішчыц. Увогуле, вобраз птушкі ў вершах аўтаркі дапамагае раскрыць унутраны свет лірычнай гераіні. Нездарма яе называлі "палескай ластаўкай":

*То, нібы ліст,*
*Злятаю на*
*траву. І думаю:*
*Як-небудзь*
*дажыву Да слоў*
*тваіх,*
*Як да гукальнай песні…* [1]

Лірычная гераіня Я. Янішчыц хацела перахітрыць сябе і пераадолець каханне. На вялікае шкадаванне, ёй гэта не ўдалося. Гэтае пачуццё засталося з ёй на ўсё жыццё, назаўсёды пасялілася ў жаночым сэрцы. Яна не абвінавачвае каханага, а застаецца ўдзячнай яму за тое, што даў ёй магчымасць зведаць такое цудоўнае пачуццё, пакахаць. Закаханая нават спадзяецца на сустрэчу і верыць, што калі-небудзь усё ж такі каханне прынясе ёй шчасце, прынясе тыя эмоцыі і пачуцці, пра якія яна марыла, будучы маленькай летуценнай дзяўчынкай.

Дык якая ж яна, лірычная гераіня Яўгеніі Янішчыц? Гэта асоба, якая тонка адчувае ўсе нюансы чалавечых стасункаў і не дазваляе сабе схіляцца пад ударамі лёсу. У першых зборніках мы бачым закаханую маладую дзяўчынку, якая жыве марамі і думкамі пра свайго адзінага і непаўторнага, якая чакае ад жыцця ўсяго самага лепшага і верыць у шчаслівую будучыню. Але жыццё мяняецца, а разам з ім мяняецца і чалавек. Ён расце, пазнае свет, людзей. У пазнейшых зборніках перад намі паўстае мудрая, разважлівая жанчына, якая ўжо набыла жыццёвы вопыт і жыве ў рэальнасці, а рэальнасць, на вялікае шкадаванне, не такая шчаслівая, як здавалася гэта той маладой закаханай дзяўчынцы.

**Літаратура**

1 Янішчыц, Я. Творы / Я. Янішчыц // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Jauhienija_Janiscyc/. – Дата доступа : 26.04.2022.

2 Калядка, С. Непрыручаная птушка Палесся. Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. Калядка. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 216 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ